# Разносна-развозны і вулічны гандаль на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд

УДК 94 (476) «1921/1939»



**Ларыса ЛАЎРЭНКА, кандыдат гістарычных навук**



**Людміла ЛАЎРЭНКА, філолаг**

Ларыса ЛАЎРЭНКА, Людміла ЛАЎРЭНКА. Разносна-развозны і вулічны гандаль на заходнебеларускіх землях у міжваенны перыяд. У артыкуле аўтары характарызуюць найбольш распаўсюджаныя формы гандлю ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гады – разносна-развозны і вулічны. Вызначана іх роля ў эканамічным жыцці заходнебеларускіх зямель міжваеннага перыяду. Выкарыстаны багаты фактычны матэрыял. Робіцца высновa, што развозна-разносны і вулічны гандаль з'яўляўся важным, а часам і адзіным сродкам выжывання заходнебеларускіх беспрацоўных гараджан і беззямельных сялян таго часу.
Ключевые слова: Заходняя Беларусь, эканоміка, гандаль, разносна-развозны гандаль, вулічны гандаль.

Larisa LAVREENKO, Lyudmila LAVREENKO. Street peddling and vending in Western Belarusian lands in the interwar period. The authors examine street peddling and vending, the most common types of trade in Western Belarus in 1921–1939, and explore their role in the economic life of the Western Belarusian lands in the interwar period. Based on the rich factual material, the authors describe the development of these activities in Western Belarus in 1921–1939 and determine their specifics. The authors conclude that street peddling and vending were an important and sometimes the only means of survival for the unemployed townspeople and landless peasants of Western Belarus in the 1920s-1930s.
Keywords: Western Belarus, economy, trade, street peddling, street vending.

Падставай для пачатку гандлёвай дзейнасці ў Польскай дзяржаве было набыццё прамысловага пасведчання. Існавала пяць катэгорый у залежнасці ад памеру прадпрыемства і віду гандлю: I катэгорыя – аптовыя прадпрыемствы, II – вялікі рознічны гандаль, дробны опт, спецыяльны гандаль, III – рознічны гандаль, які ажыццяўляўся ў краме, дзе працаваў хаця б адзін наёмны работнік, IV – дробны продаж у крамах, дзе купец працаваў толькі са сваёй сям'ёй, а таксама гандаль у кіёсках, будках і г. д., V – развозны гандаль (Va) і гандаль уразнос (Vв). Значная колькасць прадпрыемстваў IV катэгорыі адносілася да кіёскаў, будак і г. д. Паміж гандлёвымі прадпрыемствамі IV і V катэгорый межы вельмі часта былі сцёртымі *[1, s. 18; 2, s. 18; 3, s. 7; 4, с. 58]*.

Прадпрыемствы V катэгорыі – надзвычай распаўсюджаная ў той час форма гандлю, якая была прадстаўлена велізарнай колькасцю гандляроў, якія працавалі нелегальна. Толькі невялікі працэнт гэтага віду гандляроў выкуплялі прамысловыя пасведчанні і плацілі падаткі. Цэны на пасведчанні Va і Vв для ўсіх мясцовасцей складалі 50 і 15 злотых адпаведна. Аднак, калі ўлічыць дадатковыя выплаты – 15 % дзяржаўнай выплаты, 30 % на карысць мясцовага самакіравання, 15 % на карысць Прамыслова-гандлёвай палаты і інш., то цэны гэтых пасведчанняў маглі даходзіць да 92,5 злотага для катэгорыі Va і 27,75 злотага для Vв *[5, s. 13]*.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–30-я гады разносны, развозны і вулічны гандаль найбольш распаўсюджаны. Паняцці «гандаль уразнос» і «вулічны гандаль» супадаюць з паняццем «вандроўны гандаль», якое падзяляецца на гандаль уразнос і развозны, – запазычаны з закона пра дзяржаўны прамысловы

падатак, а таксама адпаведнага паняццю «акруговай прамысловасці», узятага з прамысловага права. Паводле распараджэння Прэзідэнта Польшчы ад 22 сакавіка 1928 года «Аб часе гандлю і часе адкрыцця гандлёвых прадпрыемстваў і некаторых прамысловых», пад вулічным гандлем разумеўся продаж, што ажыццяўляўся на вуліцах і плошчах з рухомых месцаў продажу, такіх як кошыкі, маленькія столікі, скрыні і г. д. Продаж газет і часопісаў, а таксама тытунёвых вырабаў у вулічных кіёсках, у якіх не прадаваліся ніякія іншыя тавары, таксама лічыўся вулічным продажам *[6, s. 803–804; 4, c. 58]*.

Паводле пастаноў пра дзяржаўны прамысловы падатак, у вандроўным гандлі заняткам лічылася: для гандлю ўразнос – продаж тавараў са скрынак, куфраў, валізак і т. п., якія перамяшчаліся з месца на месца купцом; для развознага гандлю – продаж тавару з воза, лодкі і г. д., які перавозіўся з месца на месца. Вулічны гандаль ажыццяўляўся на рынку за спецыяльна абсталяваным столікам *[7, арк. 34]*. Разносны і развозны гандаль – разнос тавараў галоўным чынам па хатах. Людзі, якія займаліся гэтым відам гандлю, былі непераборлівымі ў выбары сваёй кліентуры. Шматлікія тавары, якія імі рэалізоўваліся, не заўсёды вылучаліся якасцю, але вельмі часта прадаваліся па коштах, вышэйшых за рынкавыя. Пры гэтым шырока практыкаваўся продаж тавараў у растэрміноўку *[7, арк. 34]*.

Разносным, развозным і вулічным гандлем займалася перш за ўсё гарадское насельніцтва, у большасці сваёй – яўрэі. Напрыклад, у Палескім ваяводстве ў 20-х гадах XX стагоддзя яўрэі складалі 90 % ад агульнай колькасці гандляроў. Але ўжо ў 1936 годзе на тэрыторыі Брэсцкага павета з 47 ліцэнзій, выдадзеных на развоз тавараў, яўрэям належала 19 (40,4 %) *[7, арк. 40]*. Можна выказаць меркаванне, што развозны гандаль усё менш прываблівае яўрэяў, і на іх месца прыходзілі хрысціяне. Вулічны гандаль быў звязаны з вялікімі гарадамі, часткова з мястэчкамі і вёскамі. На вёсцы гэта форма найбольш выяўлялася ў рынкавым гандлі. Вулічныя гандляры-хрысціяне займаліся продажам пераважна нехарчовых тавараў, у той час як сярод гандляроў-яўрэяў быў распаўсюджаны продаж харчовых тавараў. У яўрэяў нехарчовымі таварамі гандлявалі, як правіла, мужчыны, а сярод хрысціян – жанчыны *[5, s. 27]*.

Каб займацца разносна-развозным гандлем, неабходна было атрымаць ліцэнзію, якая выдавалася прамысловай уладай I інстанцыі. Без ліцэнзіі дазвалялася гандляваць толькі неапрацаванымі прадуктамі сельскай, лясной і садовай гаспадарак. На тэрыторыі Пінскага павета ў 1936 годзе было выдадзена 54 ліцэнзіі на развозны промысел, з якіх 28 – на продаж бакалейных тавараў, галантарэйных вырабаў, а таксама на скупку для перапродажу рыззя, пакулля, бутэлек і старога жалеза; 7 – на вулічны продаж марожанага з вазка; 7 – на продаж мануфактуры і гардзін; 5 – на выкананне фатаграфічных здымкаў на вуліцы; па 2 – на продаж вырабаў,


## ПРА АЎТАРАЎ

ЛАЎРЭЕНКА Ларыса Віктараўна.

Нарадзілася ў г. Брагіне Гомельскай вобласці. Скончыла гістарычны (2009) і юрыдычны (2018) факультэты Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (БрДУ) імя А.С. Пушкіна.

З 2009 па 2016 год працавала выкладчыкам кафедры педагогікі БрДУ імя А.С. Пушкіна. З 2016 года – настаўнік гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы в. Скокі Брэсцкага раёна.

Кандыдат гістарычных навук (2021).

Аўтар 55 навуковых публікацый, у тым ліку трох калектыўных манаграфій, аднаго навукова-папулярнага выдання (у суаўтарстве).

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, гісторыя паўсядзённасці, гістарычнае краязнаўства.

ЛАЎРЭЕНКА Людміла Віктараўна.

Нарадзілася ў г. Брагіне Гомельскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (БрДУ) імя А.С. Пушкіна (2009).

З 2009 года – настаўнік беларускай мовы і літаратуры Хаціслаўскай сярэдняй школы Маларыцкага раёна.

Настаўнік вышэйшай катэгорыі.

Аўтар пяці навуковых публікацый.

Сфера навуковых інтарэсаў: міжпрадметныя сувязі ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры, гістарычнае літаратуразнаўства, гісторыя паўсядзённасці, гістарычнае краязнаўства.


№ 1149

ŚWIADECTWO
PRZEMYSŁOWE
DLA
HANDLU ROZWOZOWEGO
KATEGORJI Va
NA ROK 192
PODATEK MAREK 750
DODATKI
KASA SKARBOWA
w Pińsku

**Прамысловае пасведчанне Va на ажыццяўленне развознага гандлю**

Крыніца: Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці – Ф. 2003. Воп. 1. Спр. 376. Арк. 12.

пакрытых металам, і на продаж галантарэі; па 1 – на перапродаж скуры, продаж жалезных вырабаў, а таксама кавы і гарбаты *[4, с. 59; 7, арк. 40]*. У тым жа 1936 годзе, напрыклад, у Кобрынскім павеце вандроўным гандлем займаўся 31 чалавек, вулічным – 48 *[7, арк. 36]*. Спецыяльны тып разносчыкаў складалі музыканты, фокуснікі і жанглёры. Павялічылася колькасць музыкантаў, якія хадзілі па хатах.

Галоўнымі цэнтрамі разноснага, развознага і вулічнага гандлю ў Палескім ваяводстве былі Брэст, Пінск, Столін, Давыд-Гарадок і Гарадная (Столінскі павет) *[5, s. 19]*. У Брэсце 47 чалавек займаліся разносна-развозным гандлем, у Пінску – 52. У Столінскім павеце колькасць гэтага віду гандляроў даходзіла да 400 чалавек, у той час як вулічным гандлем там займалася толькі 20 чалавек *[5, s. 19; 4, с. 59]*.

Разносна-развозны гандаль быў разлічаны ў асноўным на скупку тавараў з мэтай перапродажу. Менавіта перапродаж найбольш распаўсюдзіўся і праводзіўся на аснове абмену. Скуплялася рыззё, пакулле, лён, грыбы і г. д. і абменьвалася на галантарэю, мыла і запалкі. У базарныя дні гандляры скуплялі ў земляробаў птушку, масла, яйкі. У пякарнях набывалі печыва, якое потым разносілася па вуліцах і дамах. Гандляры марожаным з Давыд-Гарадка з пачаткам сезону бралі з сабой амуніцыю, неабходную для доўгага пастою ў іншых гарадах, і адпраўляліся ў суседнія паветы, дзе выраблялі і прадавалі свой тавар за наяўныя грошы *[7, арк. 39]*. Ганчары з Гараднай мянялі свае гаршкі ў асноўным на зерне. Неабходна звярнуць увагу на тое, што разносна-развозны і вулічны гандаль у вялікіх гарадах быў слаба развіты. Там пераважна асобы з суседніх ваяводстваў гандлявалі мануфактурай, кілімамі і г. д. *[7, арк. 26 зв; 8, с. 370]*.

Сур'ёзную групу тавараў, якія прадаваліся на вуліцы, складалі харчовыя: гародніна, садавіна, яйкі, птушка, рыба і малако, гарачыя бабы, гарох, розныя кашы, супы, рыба, малако, кава, какава і інш. Продаж закусак і напояў ажыццяўляўся з чыгуноў, вёдраў і гарлачоў у даволі антысанітарыйных умовах. Спажыўцамі гэтых тавараў былі насільшчыкі, вознікі, вулічныя гандляры, а таксама рабочыя, крамнікі і рамеснікі.

Акрамя харчовых прадуктаў, вулічны гандаль займаўся дробнай галантарэяй (шнуркі, запалкі і інш.), прапануючы пакупнікам розныя навінкі. Дробны гандаль галантарэяй быў распаўсюджаны каля рынкаў і гандлёвых месцаў (памяшканні, мясныя латкі, месцы продажу гародніны, рыбы і г. д.). Продаж галантарэі адбываўся з кошыкаў на тратуарах. Прапаноўвалі панчохі, шкарпэткі, рукавіцы, ніткі, гузікі, іголкі, шпількі, люстэркі, грабяні, шнуркі для ботаў і інш. Акрамя таго, прадаваліся трыкатажныя вырабы – прадметы фабрычнай вытворчасці або ручной працы. Займаліся такім гандлем пераважна жанчыны, якія сядзелі з кошыкамі і вязалі, выконваючы замовы, ці рыхтавалі тавар да продажу. Важнай асаблівасцю гэтай формы гандлю была вялікая разнастайнасць тавару, прыстасаванага да патрэб небагатага насельніцтва *[5, s. 19]*.

Продаж ажыццяўляўся таксама ў брамах хат і на вуглах ажыўленых вуліц. Гандляры часта пераходзілі з месца на месца. Тым, у каго скончыўся тэрмін дзеяння дазволу на гандаль ці ўвогуле яго не было, часта даводзілася ўцякаць ад паліцыі.

Вулічныя гандляры вельмі часта мянялі (чатыры разы за тыдзень) асартымент тавараў, пераходзячы, напрыклад, з гальштукаў на грабяні, з грабянёў на панчохі і г. д. – у залежнасці не толькі ад сезону, але найперш ад магчымасці набыцця таннага тавару з публічнага гандлю, пасля ліквідацыі прадпрыемства, а таксама бракаваных партый. Распаўсюджваўся таксама продаж трыкатажных вырабаў, такіх як кардыганы, жакеты, ніжняя бялізна, берэты, купальныя касцюмы і інш.

На вуліцах гарадоў прадавалі і вырабы са шкла (кубкі, талеркі), нажы, нажніцы, алюмініевыя лыжкі, кнігі, розныя прадметы ўласнага вырабу, як гіпсавыя фігуры, скураныя кошыкі, рукавічкі, штучныя кветкі, паштоўкі, манаграмы, фішкі, узоры да гафту, драцяныя вырабы, цацкі, зэдлікі, крэслы. Гандляры гучна расхвальвалі свой тавар шляхам адначасовага выкрыквання яго назвы, кошту і казалі, што ў крамах кошт значна вышэйшы, ці прамаўлялі маналогі, якія суправаджаліся дэманстрацыяй спосабу выкарыстання тавару *[5, s. 1]*.

Гандляры скуплялі таксама паношаную адзежу і перапрадавалі яе прахожым. Асабліва распаўсюджаным быў вулічны продаж запальніц і запальных камянёў, які адбываўся з парушэннямі палажэнняў не толькі прамысловага, але і мытнага права, а таксама запалкавай манаполіі: такія рэчы лічыліся кантрабандай. Прадаўцы маглі гучна рэкламаваць, напрыклад, календары, а калі прахожы набліжаўся да іх, прапаноўвалі прыглушаным голасам: «Запальніцы, камяні» *[5, s. 20–21]*.

Гандаль кантрабанднымі таварамі ў 1920-я гады быў вельмі распаўсюджаным. Да пачатку 1921 года 50 % кантрабанды трапляла ў Савецкую Расію праз заходнюю мяжу. Гэтаму спрыяла слаба наладжаная савецкая пагранічная служба. Часам чырвонаармейцы-пагранічнікі спецыяльна не затрымлівалі кантрабандыстаў, бо не разумелі, навошта перашкаджаць правозу неабходных насельніцтву прадуктаў і рэчаў *[9, с. 83–84]*. Кантрабанда была спосабам зарабіць хутка і шмат. За адзін паход кантрабандыст мог выручыць ад 15 да 20 рублёў *[10, с. 93–97]*. Пашырэнню і актывізацыі такой дзейнасці спрыялі таксама транзітныя лаўкі («транзіткі») – спецыяльныя гандлёвыя ўстановы, якія і займаліся забеспячэннем таварамі менавіта кантрабандыстаў. Лаўкі знаходзіліся на нейтральнай паласе перад лініяй польскай пагранічнай аховы, якая не чыніла перашкоды «гандлярам». «Транзіткі» былі зачынены толькі ў 1926 годзе *[9, с. 83–84]*. Асноўныя формы

**Разносны і вулічны гандаль на плошчы Лукішкі ў Вільні. 1934 год**
Крыніца: фота Вілем ван дэ Пола з адкрытых крыніц.



**Прадавец гусей. Пінск, 1934 год**
Крыніца: фота Луізы Арнер Бойд з адкрытых крыніц.



кантрабанды – гэта таемны перанос і перавоз тавараў гужавым транспартам у схованках, увоз пасажырамі па чыгунцы. Больш за 50 % сялян з памежных вёсак правозілі кантрабанду ў бочках са смалой з падвесным дном, бутэлькі спірту, якія завязвалі вакол пояса, а таксама гадзіннікі ў выдзеўбаных паленах *[10, с. 93–97]*.

Як вулічны гандляр, так і разносчык прадавалі свой тавар назойліва, прапануючы пераважна няякасныя рэчы невядомага паходжання з розных нелегальных аптовых складоў.

Вулічны продаж газет і часопісаў, а таксама тытунёвых вырабаў мог ажыццяўляцца з 7 гадзін раніцы да 23 гадзін вечара, а усіх іншых тавараў – толькі падчас працы магазінаў, г. зн. без перавышэння 10 гадзін у суткі і не пазней за 19 гадзін. Працягласць працы гандлёвых устаноў, час іх адкрыцця і закрыцця вызначалі павятовыя ўлады агульнай адміністрацыі па ўзгадненні з інспектарам працы, гандлёва-прамысловых і рамесных палат адпаведных акруг *[6, s. 803–804]*.

Вандроўны гандаль ахопліваў вялікі асартымент тавараў (за выключэннем раскошных і дарагіх), якія можна было размясціць у ручных валізках і кошыках.

Гандляры ў большасці не мелі ўласнага тавару, закупляліся ў вялікіх рознічных крамах, а не на аптовых складах, бо не рабілі пакупак на замову, але кожны раз набывалі тавар для задавальнення попыту асобных спажыўцоў (напрыклад, па некалькі метраў палатна). Разносчык разлічваўся з уладальнікам крамы за наяўныя грошы, але мог карыстацца крэдытам. У крэдыт ажыццяўляўся таксама продаж тавараў пакупнікам. Спажывец мог плаціць часткамі, пісьмовая дамова не заключалася. Колькасць і памер узносаў былі адноснымі. Здзелка на агульную суму 15 злотых выплачвалася ў штотыднёвую растэрміноўку па 1 злотым. Былі таксама здзелкі на некалькі сотняў злотых, якія аддаваліся роўнымі долямі на працягу некалькіх месяцаў *[5, s. 23]*.

**Вулічны гандаль у Слоніме**

Крыніца: У.А. Ліхадзедаў. Слонім. Падарожжа ў часе. – Мінск, 2019. – С. 75.



На сістэме ўзносаў быў заснаваны і вандроўны продаж рознага тавару: ілюстрацый, люстраў, чаю, какавы, шакаладу, мяса, птушкі, масла, сыру, смятаны, малака, яек, садавіны, гародніны, хлеба. Неабходна пры гэтым адзначыць, што продаж харчовых прадуктаў адбываўся пераважна «на кнігу», у якой вёўся пастаянны ўлік запазычанасці. У крэдыт не прадаваліся харчовыя каланіяльныя і касметычныя тавары *[5, s. 24]*. Развозчыкі, якія гандлявалі па вёсках, збіралі замовы на тавары і дастаўлялі іх наступным разам. Асобныя разносчыкі абыходзілі дзяржаўныя ўстановы, дзе мелі сталых пакупнікоў сярод службоўцаў *[5, s. 20–21]*.

Той, хто жадаў заняцца акруговым промыслам, павінен быў атрымаць ліцэнзію ў прамысловай улады I інстанцыі (старасты) той мясцовасці, дзе пражываў. Так, згодна з распараджэннем прэзідэнта Польшчы ад 7 чэрвеня 1927 года «Аб прамысловым праве» акруговым промыслам лічыўся занятак для заробку, выкананы самастойна, прафесійна і асабіста без сталага месцазнаходжання. Закон да акруговага промыслу адносіў продаж тавараў (мануфактуры, кілімаў, мяса з рытуальнага забою, насенне сланечніка, гародніны, цукерак і інш.) *[11, арк. 8; 12, арк. 19]*; скупку для перапродажу тавараў у іншых асоб, а не ў гандляроў ці ў іншых

месцах, не прызначаных для продажу тавараў; правядзенне і выкананне дробных паслуг прамысловага характару.

Ліцэнзія выдавалася на адзін каляндарны год і сапраўднай была толькі на тэрыторыі ваяводства, у якім была выдадзена. Для таго каб ажыццяўляць гандаль у іншых мясцовасцях, неабходна было звярнуцца з прашэннем да прамысловых улад адпаведнага ваяводства, якія маглі пашырыць дзеянне ўжо існуючай ліцэнзіі на іх тэрыторыі. Ліцэнзія аплачвалася як і прамысловае пасведчанне V катэгорыі. Так, на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1930 годзе кошт прамысловага пасведчання V катэгорыі вар'іраваў ад 15 да 50 злотых *[13, арк. 10; 11, арк. 13, 44; 14, арк. 7 адв, 10, 12, 17; 15, s. 223–224]*.



**Гандляр марожаным каля Казанскай царквы ў Давыд-Гарадку. 1930-я гады**
Крыніца: фота з асабістага архіва Анатоля Іванчыкава.

Тым, хто займаўся акруговым промыслам, забаранялася прадаваць і скупляць алкагольныя напоі, каштоўныя камяні, плаціну, золата, серабро, прадметы, выробленыя з іх сплаваў, манеты рознага роду, карты для гульні, каштоўныя паперы, латарэйныя квіткі, піратэхнічныя вырабы і выбуховыя рэчывы, зброю і амуніцыю, прадметы ваеннага інвентару, лекавыя прэпараты і атруту. Калі гандляр выкарыстоўваў у сваёй дзейнасці вазок, кошык, будку (ці стойла) і інш., то абсталёўваў іх надпісамі, якія змяшчалі яго імя, прозвішча і месца пражывання *[16, s. 703]*.

Да акруговага промыслу адносілася і фатаграфаванне "a la minute" (раптоўнае, таннае, зробленае аўтаматычным апаратам) *[17, s. 11]*. Для яго таксама неабходна была ліцэнзія. Калі апарат для здымання размяшчаўся ў будынку, тады гэта дзейнасць адносілася да рамяства (занятак са сталым месцазнаходжаннем) і ліцэнзія на правядзенне акруговага промыслу не выдавалася. Такія фатографы павінны былі набываць рамесную картку *[18, арк. 1]*.

Адмовіць у атрыманні ліцэнзіі маглі ў выпадку, калі чалавек меў інфекцыйныя захворванні, знаходзіўся пад наглядам паліцыі, быў вядомы як жабрак, валацуга, п'яніца і г. д. Адмаўлялі таксама асобам, якім не споўніўся 21 год, тым, хто не меў польскага грамадзянства, сталага месца жыхарства і інш. *[16, s. 703]*.

Ліцэнзія не патрабавалася тым, хто асабіста ці праз дамачадцаў прадаваў акруговым спосабам прадукты сваёй сялянскай, лясной, садовай гаспадаркі, птушку, жывёлу, рыбу, атрыманых у выніку палявання і рыбалоўства; за 15 кіламетраў ад месца свайго пражывання прадаваў акруговым спосабам вырабы, што належалі да прадметаў звычайнага звароту малога гандлю, або выконваў дробныя паслугі прамысловага характару *[16, s. 703; 19, арк. 3, 6]*. На тэрыторыі Брэсцкага павета было выдадзена 47 ліцэнзій на правядзенне акруговага промыслу, з якіх 19 належала яўрэям: вулічнае фатаграфаванне – дзевяць ліцэнзій; продаж марожанага – 15, галантарэі, посуду, пісьмовых матэрыялаў і інш. – 13; шліфоўшчыкі і тачыльшчыкі – адна; продаж карцін – адна; продаж такіх харчовых тавараў, як какава, гарбата (ва ўпакоўках) – чатыры; скупка ануч – дзве *[7, арк. 40]*.

Асобную групу складалі агенты, тыповыя пасрэднікі паміж аптовым і рознічным гандлем. Асноўнай іх задачай было павелічэнне абаротаў вытворчасці. Агенты падзяляліся на два тыпы: пасрэднікі і прадстаўнікі інтарэсаў якога-небудзь прадпрыемства. Паводле польскага заканадаўства, агентамі маглі быць толькі купцы. Паміж агентамі і купцамі абавязкова складаліся дамовы як на вызначаны, так і на нявызначаны час *[20, арк. 2–4]*. Агенты некаторых тэкстыльных фабрык, якія наведвалі дзяржаўныя ўстановы і органы мясцовага

самакіравання, а таксама гаспадарчыя арганізацыі, банкі і г. д., прапаноўвалі рабочым тавары іх прадпрыемстваў, карысталіся вялікай колькасцю ўзораў. Продаж ажыццяўляўся на ўмовах крэдыту. Пасля атрымання агентам падпісаных пакупніком абавязацельстваў аб унясенні ўзносу адпаведнага памеру ва ўстаноўленыя тэрміны фабрыка высылала на адрас кліента тавар *[5, s. 23]*.

Гандляры Заходняй Беларусі захоўвалі ўсе традыцыйныя прыёмы і метады продажу, а таксама імкнуліся ўжываць новыя: праз пошту, на замову з дастаўкай пакупніку. Яны шырока выкарыстоўваюцца і ў сучасным гандлі. Пачынальнікамі новаўвядзенняў часта выступалі дробныя гандляры, пастаўленыя ў жорсткія ўмовы канкурэнцыі. У той жа час захоўваліся несумленныя метады продажу і, больш за тое, – арганізаваная злачыннасць.

Спрадвечны і своеасаблівы прыём гандлю – злоўжыванні былі, як правіла, рэакцыяй на недасканаласць законаў і крызісную сітуацыю на рынку, якія не дазвалялі гандлярам сумленна зарабляць грошы. Выкарыстанне недакладных мер і вагі заставалася штодзённай з'явай *[2, s. 85]*. Вельмі частымі былі выпадкі, што развозчыкі карысталіся недасведчанасцю сялян і прадавалі ім тавары па цэнах на 100 % вышэйшых за тыя, што існавалі ў стацыянарных крамах у гарадах *[7, арк. 39]*.

У некаторых выпадках злоўжыванні станавіліся арганізаванымі, набывалі бандыцкія формы з выкарыстаннем не толькі змовы і падману, але і прамога гвалту, подкупу паліцыі. Банды «апекавалі» гандляроў, якія плацілі ім адпаведны «падатак», «распраўляліся» з іх канкурэнтамі (часта палкай і нажом), тэрарызавалі кліентаў, а ў далейшым падпарадкоўвалі сабе сваіх «падапечных» і, урэшце, самі пачыналі рэгуляваць продажы і дыктаваць цэны *[1, s. 117]*.

Вельмі распаўсюджанай з'явай у гандлі стала спекуляцыя, з якой мясцовыя ўлады вялі актыўную барацьбу. Была створана Камісія па барацьбе са спекуляцыяй, а камісарыяты дзяржаўнай паліцыі штомесяц падавалі ў старостры спісы асоб, што прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за спекуляцыю. Так, напрыклад, 30 мая 1923 года паліцэйскім Бродніцкай гміны Пінскага павета А. Смальянавым быў складзены пратакол у справе скупкі па вёсках харчовых прадуктаў на жыхароў г. Пінска Іцка і Малку Айзенберг. Згодна з пратаколам паліцэйскага, вяртаючыся са службы, між вёскамі ён заўважыў фурманку, напоўненую саломай, якой кіравалі Айзенбергі. Падчас агляду паліцэйскі пераканаўся, што ў фурманцы гаспадароў, акрамя саломы, ёсць і больш каштоўныя рэчы: чатыры пуды фасолі, 20 фунтаў гароху, два пуды аўса, 15 фунтаў проса, 20 фунтаў ячменю, 15 фунтаў грэчкі, тры пуды льнянога семені, цялячая і авечая скуры, 54 казіныя скуры, 27 кур. Як адзначана ў пратаколе, Іцка Айзенберг сцвярджаў, што скупляў у жыхароў суседніх вёсак прадукты і вазіў іх на рынак, але нічога не змог там прадаць. Пінскім староствам Іцка і Малка Айзенберг былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу памерам 500 000 марак і 45 дзён арышту. Гэта было вельмі суровае пакаранне, Айзенбергі звярнуліся да Палескага ваяводскага ўпраўлення з прашэннем адмяніць прысуд. Малка Айзенберг у сваім звароце да ваяводскага ўпраўлення пісала, што ў яе слабае здароўе і яна ніколі не займалася гандлем. Муж працуе кавалём, за сваю працу вельмі часта атрымлівае плату харчовымі прадуктамі і прывозіць сваёй сям'і ў Пінск. Усе прадукты ішлі на ўласныя патрэбы. Аднак Палескае ваяводскае ўпраўленне падтрымала рашэнне Пінскага староства і пагадзілася з тым, што быў парушаны закон, а Іцка Айзенберг займаўся скупкай прадуктаў па вёсках з мэтай іх далейшага перапродажу, не маючы дазволу на разносна-развозны гандаль *[21, арк. 3–13]*.

Рэгламентацыя гандлю і цэн на тавары шырокага ўжытку стрымлівала істотныя канфлікты паміж пакупнікамі і прадаўцамі. У крыніцах яны не зафіксаваны. Вулічныя і вандроўныя гандляры мелі паважлівыя адносіны з пакупнікамі ў вёсках. Гвалтоўныя і злачынныя метады барацьбы прадаўцоў за пакупніка ў гарадах не сталі масавымі і выяўляліся толькі з боку польскіх гандляроў.

Разносна-развозны і вулічны гандаль не меў трывалай арганізацыйнай або фінансавай асновы і часта быў заснаваны на салідарнасці гандляроў (напрыклад, калі ідзе размова аб абароне ад органаў улады і паліцыі).

Цяжкая эканамічная сітуацыя ў краіне, беспрацоўе, збядненне спажыўцоў, зніжэнне тавараабароту – асноўныя фактары, што ўплывалі на колькасны рост разносна-развазнога і вулічнага гандлю. Многія гаспадары крам і лавак змушаны былі праз страты зачыняць свае прадпрыемствы і пераходзіць з вышэйшай гандлёвай катэгорыі на больш нізкую, тым самым папаўняючы рады разносчыкаў і вулічных гандляроў.

Стымулам для занятку разносным і вулічным гандлем з'яўлялася яго прымітыўнасць, магчымасць прыступіць да працы амаль без якіх-небудзь фінансавых сродкаў, лёгкасць збыту тавару праз недасведчанасць спажыўца, якому прапанавалі танны і няякасны тавар, і адсутнасць кантролю з боку ўлад. Яшчэ адным станоўчым фактарам для заняцця разносна-развозным гандлем можна назваць недасканаласць польскага падатковага заканадаўства. У большасці выпадкаў прадстаўнікоў разноснага і вулічнага гандлю маглі прыцягнуць да адказнасці толькі на падставе закона «Аб барацьбе з нядобрасумленнай канкурэнцыяй» (1930), а дакладна – за ўмяшанне ў кліентуру канкурэнта, зман адносна паходжання тавару і прадастаўленне лжывай інфармацыі аб канкурэнце. Прыцягнуць да адказнасці такіх гандляроў было вельмі складана, хаця б з прычыны адсутнасці звестак аб іх месцажыхарстве (толькі 5 % ад агульнай колькасці гандляроў гэтай формы мелі пасведчанне на права вядзення гандлю, астатнія займаліся ім нелегальна). Акрамя таго, разносчыкі і вулічныя гандляры не плацілі падаткі (падаходны падатак спаганяўся толькі, калі даход перавышаў 1500 злотых у год) і не рабілі грамадскіх узносаў *[5, s. 32–33, 40]*.

Улічваючы ўсё сказанае вышэй, неабходна адзначыць, што разносна-развозным і вулічным гандлем займаліся не толькі прафесійныя гандляры, але і тыя, хто страціў сваё месца працы; агенты мясцовых і іншагародніх прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў; асобы, якія займаліся менавым гандлем, скупляючы ўсякага роду старызну; вялікая колькасць беспрацоўных, а таксама сяляне і рамеснікі, якім трэба было збыць свой тавар. Усе тыя, для каго такі від гандлю аказаўся адзінай магчымасцю да існавання.

Заходнебеларускі гандаль, як і польскі ўнутраны ў цэлым, у міжваенны перыяд быў асабліва адсталым, прымітыўным паводле сваіх арганізацыйных форм і метадаў працы. Ён адпавядаў агульнаму ўзроўню эканомікі, а таксама ўмовам жыцця насельніцтва. Найбольш распаўсюджанымі відамі былі разносна-развозны і вулічны гандаль, імі займаліся як прафесійныя прадаўцы, так і самі вытворцы – сяляне, рамеснікі. Даступнасць тавараў ручной працы, якімі быў запоўнены мясцовы рынак, рабілі вулічны і разносна-развозны гандаль важным, а часам і адзіным сродкам выжывання для беспрацоўных гараджан і беззямельных сялян. Толькі праблема для дробных гандляроў была не ў набыцці тавараў, а ў іх рэалізацыі на вузкім заходнебеларускім рынку, асабліва ў крызісныя 1930-я гады.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 04.09.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Hodoly, A. Handel wiejski w Polsce międzywojennej. Liczby i fakty / A. Hodoly, W. Jastrzębowski. – Warszawa: Pol. Wydaw. Gospodarcze, 1957. – 263 s.
2. Korycki, G. Etyka kupiecka i handel przywatny w Drugiej Rzeczypospolitej / G. Korycki. – Warszawa: BUP «GRAFKOMP», 1993. – 131 s.
3. Ormicki, W. Skup zawodowy i handel obnosny w województwach Wileńskim, Nowogródzkim, Poleskim i Wołyńskim (studium geograficzno-gospodarcze) / W. Ormicki. – Wilno: Izba Przemysłowo-Handlowa, 1938. – 46 s.
4. Лаўрэнка, Л.В. Рознічны гандаль і вобраз гандляра на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / Л.В. Лаўрэнка // «Асоба непадуладная часу». Творчасць Адама Міцкевіча ў кантэксце сусветнай культуры: да 220-годдзя з дня нараджэння пісьменніка: зб. матэрыялаў Міжнар. навук. канф., Брэст, 20 снежня 2018 г. / Брэсц. дзярж. тэхніч. ун-т; рэдкал.: Н.М. Борсук [і інш.]; пад агул. рэд. Ю.М. Чагайды. – Брэст: БрДТУ, 2018. – С. 58–61.

5. Szyszkowski, M. Handel domokrążny i uliczny / M. Szyszkowski. – Warszawa: [s. n.], 1937. – 43 s.
6. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 22 marca 1928 r. «O godzinach handlu i godzinach otwarcia zakładów handlowych i niektórych przemysłowych» // Dz. Ustaw Rzeczypospolitej. – 1928. – № 38. – Poz. 364. – S. 803–804.
7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 333.
8. Лаўрэнка, Л.В. Гандаль на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1921–1939 гг. / Л.В. Лаўрэнка // Гісторыя гандлю на тэрыторыі Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 24–25 верасня 2015 г. / НАН Беларусі; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 367–374.
9. Острога, В.А. История таможенного дела и таможенного права Беларуси: учеб. пособие / В.А. Острога. – Минск: ООО БИП-С Плюс, 2005. – 193 с.
10. Нашчынец, К.М. Кантрабанда як сацыяльная з'ява. Даследаванне праблемы ў 1921–1939 гадах / К.М. Нашчынец // Беларуская думка. – 2018. – № 1. – С. 91–97.
11. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 358.
12. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 662.
13. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 659.
14. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 664.
15. Kwiecień, S. Polskie prawo przemysłowe, 1927–1939 / S. Kwiecień // Zeszyty Praw. – 2011. – T. 11, № 2. – S. 207–234.
16. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 7 czerwca 1927 r. «O prawie przemysłowem» // Dz. Ustaw Rzeczypospolitej. – 1927. – № 53. – Poz. 468. – S. 697–720.
17. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Brześciu nad Bugiem o stanie gospodarczym rzemiosła w roku 1933. – Brześć nad Bugiem: Izba Rzemieślnicza, 1934. – 62 s.
18. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 331.
19. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2254.
20. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zesp. 12. Sygn. 106.
21. ДАБр. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 401.